*Інфармацыя Аналітыка Публіцыстыка*

***№1 люты 2011***

# ПРЭЗУМПЦЫЯ

***Гарадзенскі праваабарончы інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь***

**у нумары:**

**Хроніка ст. 4**



**у нумары:**

**Тэлефон ст. 6**



**у нумары:**

**Суседзі ст. 7**



**Галоўнае ў нумары: Гарадзенец Алесь Кіркевіч абвінавачваецца ў масавых беспарадках.** **ст. 2**



**Артыкул 293 "Масавыя беспарадкі"**

1. Арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаюцца гвалтам над асобай, пагромамі, падпаламі, знішчэннем маёмасці, узброеным супраціўвам прадстаўнікам улады

- караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

2. Удзел у масавых беспарадках, якое выказалася ў непасрэдным здзяйсненні дзеянняў, названых у частцы першай дадзенага, артыкула

- караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў.

*Намесьніку старшыні незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Алесю Кіркевічу з Гародні, які цяпер знаходзіцца ў турме КДБ, прад'яўлена абвінавачаньне паводле ч.2 арт.293 Крымінальнага кодэксу — актыўны ўдзел у масавых беспарадках.*

*Яму пагражае ад трох да васьмі гадоў пазбаўленьня волі.*

# Гарадзенец Алесь Кіркевіч абвінавачваецца ў масавых беспарадках

28 студзеня чатыры супрацоўнікі спецслужбаў у Гродне ўварваліся ў кватэру намесніка старшыні Маладога Фронту Алеся Кіркевіча. Правялі ператрус. Забралі камп'ютар, агітацыйныя матэрыялы за Віталя Рымашэўскага, флэшку ад фотаапарата. Ператрус фіксаваўся на відэа і фотакамеры.

Потым Алеся павезлі на допыт у гродзенскае аддзяленне КДБ. Там яго трымалі тры гадзіны. Пасля яму паведамілі, што яго абвінавачваюць у актыўным удзеле ў несанкцыянаванай акцыі і зараз павязуць у „амерыканку“.

Алесь пазбег арышту на Плошчы, але праз пару дзён яго не абышло выпрабаванне суткамі. Хлопца затрымалі за ўдзел у акцыі салідарнасці пад сценамі Акрэсціна. Маладыя людзі спявалі калядныя песні для арыштаваных удзельнікаў вулічнай акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў каля плоту турмы на вуліцы Акрэсціна.

Кіркевіча пасадзілі на 10 сутак.

6 студзеня Алеся зноў судзілі. На гэты раз у Гродне за арганізацыю передвыбарчай сустрэчы з кандыдатам у прэзідэнты Міколам Статкевічам і пакаралі штрафам.



Алесь Кіркевіч з інтэлігенцкай сям'і. ¨н паступіў на гістфак Гродзенскага ўніверсітэта на спецыяльнасць „археалогія“. Правучыўся там адзін курс, потым пераваўся на завочнае аддзяленне. А пасля ўвогуле кінуў вучобу. Вырашыў, што цяпер для яго больш важная палітычная дзейнасць. На палітычным полі Алесь стаў намеснікам старшыні Маладога Фронту.

22 студзеня Алесь Кіркевіч узяў шлюб з гарадзенскай актывісткай Надзеяй Крапівінай, якая напрыканцы мінулага году таксама адбывала адміністрацыйнае пакаранне суткамі. Але у планы маладых умяшалася спецслужбы, і 21-гадовы гродзенец Алесь Кіркевіч праз тыдзень пасля шлюбу апынуўся ў СІЗА КДБ у якасці падазраваемага па частцы 2 артыкула 293 – актыўны ўдзел у масавых беспарадках.

Зараз маладыя вымушаны праводзіць першыя месяцы свайго сумеснага жыцця паасобку. Алесю Кіркевічу пагражае ад 3 да 8 гадоў пазбаўлення волі.

***Усяго абвінавачанні па справе аб масавых непарадках былі выстаўленыя 42 чалавекам, зь іх 1 ужо асуджаны, чакаюць суду 29 чалавек пад вартай, 2 – пад хатнім арыштам пад аховай, 10 – пад падпіскай аб нявыездзе; яшчэ 12 – знаходзяцца ў статусе падазраваных, з іх 1 – пад вартай, 9 пад падпіскай аб нявыездзе, 2 – знаходзіцца па-за межамі краіны. Двум чалавекам выстаўлены абвінавачаньні ў асабліва злосным хуліганстве.***

# Іх затрымалі за плошчу

## Абвінавачаныя па крымінальнай справе па артыкуле 293, частках 1 і 2, Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь "Масавыя непарадкі"

1. Арастовіч Аляксандар – давераная асоба М. Статкевіча.
2. Атрошчанкаў Аляксандар – прэсавы сакратар передвыбарнага штабу А. Саньнікава (пад вартай)
3. Бандарэнка Зьміцер – каардынатар грамадзянскай кампаніі "Эўрапейская Беларусь" (пад вартай)
4. Брэўс Арцём – грамадзянін Расейскай Фэдэрацыі (пад вартай)
5. Буланаў Дзьмітры (пад вартай)
6. Вазьняк Сяргей – давераная асоба У. Някляева
7. Васілевіч Ільля (пад вартай)
8. Вінаградаў Павел – актывіст кампаніі "Гавары праўду" (пад вартай)
9. Гапонаў Іван (пад вартай)
10. Грыбко Арцём (пад вартай)
11. Дзьмітрыеў Андрэй – кіраўнік передвыбарнага штабу У. Някляева
12. Дрозд Дзьмітры – (пад вартай)
13. Казакоў Сяргей – актывіст "Эўрапейскай Беларусі"(пад вартай)
14. Квяткевіч Аляксандар (пад вартай)
15. Кіркевіч Алесь – актывіст "М Ф" (пад вартай)
16. Класкоўскі Аляксандар (пад вартай)
17. Кобец Уладзімер – кіраўнік передвыбарнага штабу А. Саньнікава
18. Корбан Алег – адзін з кіраўнікоў моладзевай арганізацыі АГП "Маладыя дэмакраты"

19. Ліхавід Мікіта – (пад вартай)
20. Лобан Уладзімер (пад вартай)
21. Лябедзька Анатоль – старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі (пад вартай)
22. Малчанаў Аляксандар (пад вартай)
23. Марцалеў Сяргей – кіраўнік выбарчага штабу М. Статкевіча (пад вартай)
24. Мірзаянаў Фёдар (пад вартай)
25. Міхалевіч Аляксей – кандыдат у прэзыдэнты
26. Мядзьведзь Дзьмітры (пад вартай)
27. Новік Дзьмітры (пад вартай)
28. Някляеў Уладзімір – кандыдат у прэзыдэнты
29. Пазьняк Андрэй (пад вартай)
30. Палажанка Анастасія – намесьніца старшыні "Маладога Фронту"
31. Парфянкоў Васіль – актывіст штабу У. Някляева.
32. Паўлаў Анатоль – давераная асоба Я. Раманчука
33. Радзіна Натальля – журналістка, рэдактар інтэрнэт-сайту charter97.org



34. Рымашэўскі Віталь – кандыдат у прэзыдэнты
35. Саньнікаў Андрэй – кандыдат у прэзыдэнты (пад вартай)
36. Севярынец Павел – давераная асоба кандыдата В. Рымашэўскага (пад вартай)
37. Статкевіч Мікалай – кандыдат у прэзыдэнты (пад вартай)
38. Федаркевіч Алег – удзельнік акцыі 19 сьнежня, (пад вартай)
39. Фядута Аляксандар – палітоляг, адзін з каардынатараў передвыбарнага штабу У. Някляева (пад вартай)
40. Халіп Ірына – журналістка, жонка Андрэя Саньнікава
41. Хамічэнка Ўладзімер (пад вартай)
42. Яроменак Уладзімір – актывіст “Маладога Фронту”(пад вартай)

***Яшчэ дванаццаць чалавек ёсць падазраванымі па гэтым артыкуле.***

# Неспакойная Гародня

## *(ператрусы, ператрусы...)*

На сённяшні момант гарадзенскае КДБ і міліцыя перанялі звычку сваіх сталічных калегаў, і з маніякальным задавальненнем па кожнай нагодзе, якая ім выпадае, праводзяць ператрусы па месцы працы і жыхарства палітычных апанентаў сённяшняга рэжыму. У межах заведзенай крымінальнай справы пасля падзеяў 19-га снежня ператрусы былі праведзеныя і ў многіх удзельнікаў акцыі, і нават у офісах афіцыйна зарэгістраваных партыйных структур. Гэтая тэндэнцыя не спыняецца, а наадварот набывае збачэнскі характар. Ператрусы і затрыманні цяпер праводзяць не толькі ў удзельнікаў падзеяў на плошчы, але і ў кожнага, хто па той ці іншай нагодзе патрапляе ў поле зрогу сілавікоў.

Так, 12-га лютага, студэнткі пятага курса Медычнага ўніверсітэта Кацярына Герасімчык і Вольга Багданкевіч былі затрыманы ноччу ля помніка Леніну ў Гродне. Міліцыянты абвінавацілі дзяўчат ў тым, што яны напісалі на помніку Леніну «Луку на муку». Дзяўчаты пры затрыманні мелі пры сабе налепкі Маладога фронту і раздрукоўкі з надпісам «Свабоду Кіркевічу», «Свабоду Някляеву», «Свабоду Фядуце».

Ноччу ў пакоях інтэрната, дзе жывуць дзяўчаты, па ўжо склаўшайся новай традыцыі міліцыянты зрабілі ператрус, канфіскавалі камп’ютэр, кнігі, рэкламныя матэрыялы Маладога фронту і кампаніі «Гавары праўду». Міліцыянты пагражалі студэнткам выключэннем з універсітэта, а таксама нахабна сябе паводзілі. З слоў дзяўчат яны нічога не патлумачылі, палохалі, што будзе паведамленне ў ВНУ і сказалі, што ў хуткі часе дзяўчат выкліча непасрэдна міліцыя і таксама КДБ.

14 лютага ў Гародні прыкладна каля трэцяй гадзіны ночы, побач з прыпынкам, на якім віселі ўлёткі «Свабоду Кіркевічу!», «Свабоду Дашкевічу!» былі затрыманыя Надзея Крапівіна і Вераніка Лемяноўская. Пры сабе ў дзяўчат былі ўлёткі „Свабоду Кіркевічу!“, „Свабоду Дашкевічу!“, налепкі „Маладога фронту“ ды клей.

У міліцэйскім пастарунку на дзяўчат склалі пратаколы. Крыху раней Надзея Крапівіна (жонка палітвязня Алеся Кіркевіча) адседзела 12 сутак на Акрэсьціна за ўдзел у Плошчы.

Цяпер жа, як ужо павялося, міліцыянты адразу кінуліся праводзіць ператрусы. Канфіскавалі ноўтбук, улётку і раздрукоўку заявы партыі БНФ.

Выклікае здзіўленне і тая збачэнская настырнасць, з якой супрацоўнікі спецслужбаў распраўляюцца з актывістамі. Ніяк не змаглі змірыцца сілавікі з прысудамі, якія перыядычна выносіліся вядомаму гарадзенскаму журналісту Андрэю Пачобуту. Андрэй Пачобут (на фота) быў затрыманы на плошчы Незалежнасці 19-га снежня, і суткі правёў у аўтазаку. Яго справа разглядалася ў судзе Кастрычніцкага раёну. Але ў апошні момант журналіста вызвалілі, заявіўшы, што па яго справа накіраваная на дадатковую праверку. Пазней суд Кастрычніцкага раёна г. Мінску ўсё ж пакараў журналіста штрафам у памеры 1.750.000 рублёў за «ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу». Аднак пракуратура палічыла такі прысуд занадта мяккім. Мінскі гарадскі суд пагадзіўся з гэтымі



прэтэнзіямі і прызначыў перагляд справы. Андрэя зноў затрымалі і павезлі ў сталіцу. 11 лютага гродзенскага журналіста Андрэя Пачобута асудзілі за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі 19 снежня 15-цю суткамі арышту.

Калі гэтая апантаная хваля рэпрэсій спыніцца спрагназаваць наўрат ці хто адважыцца. Толькі навошта яна патрэбная тым, хто яе праводзіць? Бо наступствы гэтага грамадзянскага супрацьстаяння прадказаць яшчэ цяжэй, чым яго працягласць.

# Хроніка правапарушэнняў

*((( Гарадзеншчына, студзень )))*

**4 студзеня** Гарадзенскага праваабаронцу і журналіста Уладзіміра Хільмановіча зноў выклікалі ў мясцовае аддзяленне КДБ. Яму патэлефанаваў следчы Грынкевіч і сказаў, што на гэты раз праваабаронцу выклікаюць на допыт у якасці сведкі па падзеях 19 снежня ў Мінску.

**5 студзеня** Грамадскага актывіста з Гродна ў трэці раз дапыталі ў Камітэце дзяржаўнай бяспекі. Пытанні як і падчас іншых допытаў тычыліся ўдзелу актывіста ў акцыі апазіцыі 19 снежня ў Мінску, пасля якой той быў затрыманы і выпушчаны з турмы на Акрэсціна толькі 29 снежня. Допыт працягваўся каля чатырох гадзін.

**10 студзеня** Слонімскага актывіста Івана Бедку выклікалі ў КДБ позвай. ¨н быў удзельнікам Плошчы і адседзеў 15 сутак на Акрэсьціна. Зь яго слоў, задавалі стандартныя пытаньні: з кім быў на Плошчы, што там рабіў і г.д., а потым зачыталі папярэджаньне

**12 студзеня** На офісе БНФ ператрус. Забралі вінчэсцер з камп'ютара і тры ўлёткі. Ператрус праводзілі ў межах заведзенай крымінальнай справы аб масавых беспарадках 19 снежня. Прычым фармулёўка ў пастанове гучала так: «провесті обыск в регіональном штабе Костусева».

**12 студзеня** На офісе БСДГ ператрус. Забралі два кампутары, носьбіты інфармацыі, друкаваныя матэрыялы.

**12 студзеня** У выніку ператрусу ў кватэры карэспандэнта "Газеты Выборчай" Андрэя Пачобута ў Гродне быў канфіскаваны ноўтбук і некалькі дзесяткаў часопісаў "Магазын Польскі". Самаго Андрэя супрацоўнікі КДБ забралі з сабой. Журналістам гэта стала вядома ад ягонай жонкі Аксаны.



**12 студзеня.** Ператрус на офісе АГП.

**12 студзеня.** У фатографа газеты Саюза палякаў "Глос з-над Немна" Аляксея Салея падчас ператрусу канфіскавалі носьбіты інфармацыі. Каб правесці ператрус у кватэры журналіста, супрацоўнікі КДБ прывезлі Салея з паліклінікі, дзе той наведваў дактароў.

**12 студзеня** Раніцай да гарадзенскага праваабаронцы Віктара Сазонава дахаты прыехалі супрацоўнікі КДБ, уручылі позву і забралі з сабой. Першапачаткова выказвалася меркаваньне, што на допыт, але як высьветлілася - для правядзеньня ператрусу ў офісным памяшканьні. Віктар Сазонаў з'яўляўся ўдзельнікам маніторынгу "Праваабаронцы за свабодныя выбары".

**13 студзеня** Суд Кастрычніцкага раёна Мінска (суддзя М. Лабко) аштрафаваў гарадзенскага журналіста на 1 млн. 750 тысяч рублёў (каля 600 долараў ЗША) паводле ч. 3 арт. 23.34 КаАП («Парушэнне парадку арганізацыі альбо правядзення масавага мерапрыемства»).

**25 студзеня** У Гародні 3 мужчыны і жанчына ў міліцэйскай форме прыйшлі на кватэру да актывіста АГП Данілы Кляўко і, нахабным чынам адмовіўшыся прадставіць ордэр, правялі ў кватэры ператрус. У міліцыі гаспадару кажуць, што ня ведаюць такіх супрацоўнікаў. Сярод іх, са слоў Кляўко, адзін быў з камэрай і ўвесь час здымаў. Прысутнічалі таксама і двое панятых, якіх ён раней ніколі ня бачыў.

**28 студзеня** У межах расследвання крымінальнай справы аб масавых беспарадках супрацоўнікі КДБ правялі ператрус у кватэры намесьніка старшыні Маладога Фронту Алеся Кіркевіча з Гародні. Падчас вобшуку былі канфіскаваныя кампутар з маніторам і іншыя носьбіты інфармацыі, старыя газеты, улёткі ў падтрымку Рымашэўскага, пасьля чаго Алеся Кіркевіча забралі на допыт у КДБ.Праз нейкі час маладафронтавец патэлефанаваў маці і сказаў, што яго вязуць у Менск. Магчыма як абраная мера стрымання - утрыманне пад вартай, так і адміністрацыйны арышт за ўдзел у акцыі 19 снежня. Актывіст ужо адседзеў 10 сутак арышту за ўдзел у акцыі салідарнасьці 25 сьнежня ў Менску. У лістападзе 2010 году Гарадзенская пракуратура вынесла Алесю Кіркевічу папярэджаньне паводле арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу (удзел у незарэгістраванай арганізацыі).

# Хроніка правапарушэнняў

## ((( Гарадзеншчына, люты )))

**2 лютага** стала ведама, што адміністрацыя Гарадзенскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Янкі Купалы пачала адлічаць студэнтаў, што ўдзельнічалі ў падзеях у Мінску 19 сьнежня. Першай ахвярай стаў Барыс Захарчук – студэнт фізіка-тэхнічнага факультэту. Цягам месяца Барыс Захарчук двойчы выклікаўся на допыт ва ўпраўленьне камітэту дзяржаўнай бясьпекі па Гарадзенскай вобласьці. Апроч таго, на кватэры, дзе ён пражывае, супрацоўнікі КДБ зрабіліператрус і канфіскавалі сістэмны блок кампутара.

Пад пагрозай адлічэньня знаходзіцца і студэнт другога курсу фізіка-тэхнічнага факультэту Яўген Бусько, які адбыў 15 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у акцыі пратэсту 19 сьнежня.



**4 лютага** ў Беларусі дзяржаўнай уладай былі агучаны прозьвішчы чатырох новых абвінавачаных па справе аб так званых "масавых беспарадках" у Менску 19 сьнежня.

Абвінавачаньне паводле 2 часткі артыкула 293 Крымінальнага кодэксу РБ (актыўны ўдзел у масавых беспарадках) прад'яўленае ў ліку іншых і гарадзенцу Алесю Кіркевічу.

**9 лютага** Надзею Крапівіну, маладую жонку Алеся Кіркевіча, які 28 студзеня быў затрыманы ў якасьці падазраванага па крымінальнай справе аб масавых беспарадках, дапыталі ў КДБ. Допыт праводзіў сьледчы Бычак, які вядзе справу Кіркевіча.

Раней Надзея Крапівіна за ўдзел у акцыі салідарнасьці 19 сьнежня атрымала 12 сутак арышту. Выйшла на волю 31 сьнежня. Алеся Кіркевіча затрымалі за ўдзел у акцыі салідарнасьці пад сьценамі Акрэсьціна і пакаралі арыштам на 10 сутак. На волю ён выйшаў толькі 3 студзеня.

**11 лютага** гарадзенскага журналіста Андрэя Пачобута асудзілі за ўдзел у акцыі 19 студзеня. Справу публіцыста разглядала суддзя Кастрычніцкага раённага суда Мінску Наталля Пратасавіцкая, якая ўнесеная ў сьпіс неўязных у краіны ЕС. Андрэй Пачобут заявіў адвод суддзі, бо палічыў, што яна ня будзе аб'ектыўнай у разглядзе яго справы. Аднак суддзя адхіліла адвод, засудзіўшы Андрэя Пачобута да 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Раней Андрэй Пачобут быў затрыманы на плошчы Незалежнасьці і суткі правёў у аўтазаку. Яго справа разглядалася ў судзе Кастрычніцкага раёну. Але ў апошні момант журналіста вызвалілі, заявіўшы, што яго справа накіраваная на дадатковую праверку. Пасьля суд Кастрычніцкага раёну ўсё ж пакараў журналіста штрафам у памеры 1.750.000 рублёў за «ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу». Пракуратура, аднак, палічыла такі прысуд занадта мяккім.

**12-га лютага** студэнткі пятага курса Медычнага універсітэта Кацярына Герасімчык і Вольга Багданкевіч былі затрыманы ноччу ля помніка Леніну ў Гродне. Міліцыянты абвінавацілі дзяўчат ў тым, што яны напісалі на помніку Леніну «Луку на муку». Дзяўчаты пры затрыманні мелі пры сабе налепкі Маладога фронту і раздрукоўкі з надпісам «Свабоду Кіркевічу», «Свабоду Някляеву», «Свабоду Фядуце».

Ноччу ў пакоях інтэрната, дзе жывуць дзяўчаты, па ўжо склаўшайся новай традыцыі міліцыянты зрабіліператрус, канфіскавалі камп'ютэр, кнігі, рэкламныя матэрыялы Маладога фронту і кампаніі «Гавары праўду»

У ноч на **14 лютага** ў Гародні былі затрыманыя моладзевыя грамадскія актывісткі Надзея Крапівіна і Веранiка Лемяноўская. Іх затрымалі за нібыта расклейваньне ўлётак. Пасьля гэтага раніцай у кватэры Крапівінай правялі ператрус, сканфіскавалі ноўтбук, улёткі "Свабоду Кіркевічу!", "Свабоду Дашкевічу!".

Удзень **14 лютага** міліцыянты правялі ператрус у кватэры сябра Партыі БНФ Міколы Лемяноўскага. Міліцыянтаў, якія хацелі без санкцыі агледзець кватэру Лемяноўскіх, гаспадар на пачатку не пусьціў дахаты.Ператрус прайшоў толькі тады, каля супрацоўнікі Ленінскага РАУС аформілі санкцыю, дадзеную пракурорам Эдуардам Бураком. Міліцыянты падчас вышуку ў Лемяноўскіх, які доўжыўся паўтары гадзіны, забралі два сістэмныя блокі і пару старых газет. Пры забіраньні рэчаў сістэмныя блокі не апячатваліся, а міліцыянты сьпярша не хацелі даваць копію пратаколу вышуку. Толькі пасля настойлівага патрабаваньня Міколы Лемяноўскага ён атрымаў гэтую паперу на рукі.

Абедзьве дзяўчыны, затрыманыя ўначы па падазрэньні ў выкананьні графіці ў падтрымку палітвязьняў, былі адпушчаны і зараз знаходзяцца на свабодзе.

# Тэлефон



***Не так даўно, адзін з супрацоўнікаў сілавых структураў, напароўшыся ў нашым офісе на матэрыялы, якія асуджалі наяўнасць у нашай краіне пакаранне смерцю, заявіў:***

***– А вы хоць раз размаўлялі з людзьмі, якіх прыгаварылі да пажыццёвага тэрміну. Яны там усе сцвярджаюць, што смяротнае пакаранне нашмат лепшае, чым пажыццёвае зняволенне. Пра што гэта гаворыць?***

***– Толькі пра тое, – адказваю я, – што пакараных утрымліваюць у бесчалавечных і невыносных умовах.***

***Супрацоўнік са мной не пагадзіўся, і кожны з нас застаўся пры сваёй думцы.***

А падзеі ў Беларусі працягвалі ўжо і без нашай дыскусіі прымушаць задумвацца на тэму таго, як абыходзяцца з людзьмі, якіх карная машына вырвала з прывычнага жыцця і схавала ад родных і блізкіх, ад сяброў, паплечнікаў, аднадумцаў, праваабаронцаў, адвакатаў і ад усяго грамадства.

Неўзабаве з следчага ізалятару КДБ пакрыху выпусцілі некалькі чалавекаў, якія знаходзяцца ў статусе падазраваных у справе масавых беспарадкаў 19-га снежня мінулага году. Каго выпусцілі пад падпіску не выязджаць за межы краіны, а каго пад хатні арышт. Пра матэрыялы следства ім гаварыць забаронена. А вось пра ўмовы ўтрымання, нібыта можна.

Сяргей Вазьняк, адзін з тых, хто быў вызвалены пад падпіску аб нявыездзе, так ахарактэрызаваў тыя ўмовы: "41 дзень я знаходзіўся ў жудасных, нялюдскіх умовах. Рэжым ўстановы вельмі рэпрэсіўны. Праседзеўшы там, можна праз два месяцы ў судзе прызнацца ў чым заўгодна, хоць у забойстве Кэнэдзі. І гэта мяне вельмі палохае: на судзе, каб зноў не патрапіць у гэтую турму, чалавек проста можа агаварыць сябе. Гэта абуральна, што ў дваццаць першым стагоддзі дзяржава так абыходзіцца з грамадзянамі, віна якіх яшчэ не даказаная судом".

Так. Іх віна яшчэ не даказана. Суду яшчэ не было. Але нават у гэтым статусе людзей трымаюць у такіх умовах, што ім становіцца невыносна.

Як сябры і паплечнікі некаторых зняволеных даведаліся, што Ўладзіміра Някляева і Ірыну Халіп вызваляюць з астрогу над хатні арышт, то ўсе па-чалавечы меркавалі, што тым прыйдзецца проста жыць у сваёй хаце. Але



гэта не зусім так. Гэта стала азначаць, што іх хата ператвараецца ў камеру. Там, і дзень і ноч сядзяць два супрацоўнікі КДБ і сочаць за кожным крокам. Змешчаным пад хатні арышт аказваецца забараняецца не толькі сустракацца з журналістамі, але і з блізкімі людзьмі, забараняецца карыстацца інтэрнэтам, размаўляць па тэлефоне, падыходзіць да вокнаў, і нават чытаць газеты…

Пасля таго, як я даведаўся пра забарону чытаць газеты, мне чамусьці ўспомніліся школьныя гады і мае настаўнікі, якія распавядалі пра несправядлівасць, якая чынілася ў царскіх астрогах над Уладзімірам Леніным і іншымі заснавальнікамі тых парадкаў, у якіх прыйшлося людзям жыць і выжываць доўгі час, і ў якіх беларусам прыходзіцца працягваць жыць і зараз. Газеты важаку сусветнага пралетарыяту тады сістэматычна прыносілі, як і лісты ад усіх, хто яму пісаў. Настаўнікі наракалі, што перапіску Уладзіміра Ілʼіча з іншымі рэвалюцыянерамі царскія служакі мелі нахабства перачытваць. Такі ў іх быў здзек над зняволеным. Таму Ленін між радкамі пісаў малаком.

Як да ўлады прыйшлі бальшавікі, то малако зняволеным перасталі выдаваць адразу і аж да сённяшняга часу. Ды і пакаранні з’явіліся кшталту такіх – “Дзесяць год без права перапіскі”. Не напішаш ні малаком, ні потам…

Вось так і тут. Нібыта ўжо не ў астрогу, нібыта і суду не было, і віна яшчэ не даказана, але ні тэлефона, ні газет, ні інтэрнэту…

Для астатняга грамадства, хто не быў на плошчы, кара пакуль што крыху мякчэйшая. Газет ім таксама не прадугледжана. Бо дзяржаўную прэсу газетамі не назавеш, а рэшткамі недзяржаўнай прэсы зараз займаецца юстыцыя. З інтэрнэтам таксама абяцалі разабрацца. Можна яго зліквідаваць у кітайскі варыянт. Адзінае, што пакінуць хіба, гэта тэлефон. Гэта для спецслужбаў найлепшае вынаходніцтва. Па ім жа, па тэлефоне, можна праслухаць размовы кожнага з кожным. А сама галоўнае, што па ім можна вылічыць усіх, хто быў на плошчы 19-га снежня 2010 году.

***Віктар Сазонаў***

# Суседзі і зайздрасць

***Наколькі ўсё ж чалавечая сквапнасць не мае межаў. Узяць бы хоць сённяшні Егіпет. Здавалася б, дастаткова спакойная краіна з багатай гісторыяй і разгалінаванай турыстычнай інфраструктурай. Плюс радовішчы нафты, бавоўна і садавіна, якія можна эксплартаваць. Здавалася б, жыві і радуйся! І той жа Хосні Мубарак (хто забыўся, альбо не ведае, выгадаваны некалі ў Маскве), мог бы кіраваць гэтай краінай да свайго скону. Тым больш, што такія асобы прагнуць улады як найбольшай у іх разуменні каштоўнасці і не здольныя самы зысці з палітычнага небасхілу. Але для таго, каб кіраваць пажыццёва, яму варта было паклапаціцца хоць бы крыху пра сваіх суайчыннікаў.***

Тыя цярпелі доўга, але калі ўжо сталі галадаць, не вытрывалі. Арабы – гэта не паўночныя карэйцы, якія дзякуючы сваім правадырам і ідэолагам чучхэ ўжо за магчымасць дыхаць, жаруць траву і лічаць, што яны жывуць у сама вольнай і шчаслівай краіне. Куды зараз занясуць шляхі гісторыі паўночнаафрыканскую дзяржаву Егіпет, ніхто не ведае. Адно зразумела – Мубарак бясслаўна скончыць сваё доўгае кіраванне. Падобнае адбываецца і ў Тунісе, дзе мясцовы дыктатар канчаткова вычарпаў цярпенне мясцовага люду.



У Беларусі голаду няма. Дзяржава спраўна выконвае сваю ідэалагічную дактрыну забеспячэння народу “чаркай і шкваркай”. Праўда, якой цаной? Бальшыню насельніцтва гэта абходзіць мала – “жила бы страна родная и нету других забот”. А краіна гэтая вінная ўжо па міжнародных пазыках і інвестыцыях мільёны даляраў. Зрэшты, пра бальшыню я пагарачыўся, апошняя выбарчая кампанія выразна паказала, што крэдыт даверу вярхоўнай уладзе няўхільна змяншаецца. Але цяпер зусім не пра гэта. Паразважаць хочацца пра тыя стэрэатыпы, што існуюць ва ўяўленні некаторых нашых суседзяў датычна Беларусі. Многія людзі на бліжным сумежжы (у Літве, Украіне, на Падляшшы) уяўляюць сабе ў Беларусі ледзь не сацыяльны рай. Прычынаў таму некалькі. Першая – гэта дзяржаўная прапаганда, нагледзяцца-наслухаюцца суседзі у памежных зонах так званай беларускай тэлевізіі і пачынаюць зайздросціць насельнікам нашай зямлі. Мала хто з іх, нават бываў у сённяшняй Беларусі. Другая прычына – знешні імідж беларускіх гарадоў і мястэчак. Яны ўпарадкаваныя як могілкі на Дзяды, знешне нібыта ўсё гожа. Але жыцця ў іх няма. Няма мясцовага самакіравання, усё залежыць ад добрай ці злой волі вертыкальнага начальства. Людзі пазбаўленыя элементарных грамадзянскіх свабодаў, магчымасці выбіраць. А тое, што ім у час выплочваюць заробкі і пенсіі – дык што тут надзвычайнага? Цікаўныя хай возьмуць і палічаць памер гэтых выплат у суадносінах да коштаў. Тады захапленне “беларускім феноменам” хутка прападзе.

¨сць яшчэ адна прычына “суседскай зайздрасці”. Гэта свае сацыяльна-эканамічныя цяжкасці. Возьмем тую ж Літву. Карупцыя і нядальнабачнасць палітыкаў не дазваляюць вывесці гэтую маленькую краіну з крызісу, у які патрапілі многія ў Еўропе. Хіба гэта нармальна, калі камунальныя платы за кватэру перавышаюць памер пенсій у многіх катэгорый грамадзян? Пра гэта і падобнае даводзілася чуць ад некалькіх выпадковых суразмоўцаў з Літвы. Многія насельнікі Беласточчыны таксама наракаюць на новыя еўразвязаўскія парадкі, сваю вярхоўную і мясцовую ўладу і захапляюцца нібыта добрым беларускім ладам. У нечым іх зразумець можна: у сучаснай еўрапейскай палітыцы ўсё больш ашуканства, несправядлівасці і хцівасці.

Але шаноўныя суседзі, літоўцы-палякі-беларусы! Нешта не відаць вашых дружных шыхтоў у беларускія амбасады і консуляты, хоць бы хто з прыхільнікаў “мудрага Бацькі” папрасіў грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Таму, хто на гэта наважыцца, напэўна яго дадуць. І яшчэ пакажуць па ўсіх “бэсэсэраўскіх” тэлеканалах. Толькі калі вы пераедзеце ў “сацыяльны рай”, то вельмі хутка спазнаеце ўсе яго “асалоды” і хутка ўцячэце назад.

Асобная гутарка пра Украіну, дзе беларускі кіраўнік папулярны як нідзе. Таму і выбралі нашы паўднёвыя суседзі падобнага сабе прэзідэнта. Не перацярпелі цяжкасцяў, не ацанілі сваёй свабоды, захацелі зноў у “савок”. І будуць мучыцца яшчэ больш, жыць у сістэме татальнай карупцыі, не хутка дачакаюцца новых свабодных выбараў.

Вось ужо сапраўды, добра там, дзе нас няма.

*Уладзімір Хільмановіч*

# *Каляндар памятных і круглых датаў Гарадзеншчыны на люты 2011 году*

**2 лютага**

265 гадоў таму (1746 ) – Памёр Мікалай Фаўстын Радзівіл, дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ. Нараджэнец Дзятлава.

150 гадоў таму (1861) – Памёр Міхал Гамаліцкі, беларускі лекар, педагог, гісторык. Пахаваны ў Вільні. Вучыўся ў Жыровічах.

5 гадоў таму (2006) – Памёр Пётр Марціноўскі, беларускі педагог, краязнавец, літаратуразнавец, кіраўнік Зельвенскага літаратурнага аб’яднаньня. Нараджэнец в. Катчыно (Мастоўскі р-н).

**4 лютага**

300 гадоў таму (1711) – У в. Ціхомль (Валынскае ваяводства) нарадзіўся Юзаф Ябланоўскі, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, гісторык, мецэнат, ваявода наваградскі ў 1755-73. Ведамы тым, што аднавіў Наваградскі замак.

**6 лютага**

90 гадоў таму (1921) – Выйшаў дэкрэт, які надаў беларускай, габрэйскай (ідыш), польскай і расейскай мовам статус дзяржаўных у БССР.

**7 лютага**

120 гадоў таму (1891) – Памёр Вінцэнт Каратынскі, беларуска-польскі паэт, публіцыст, перакладнік. Нараджэнец в. Селішча (Карэліцкі р-н).

**8 лютага**

120 гадоў таму (1891) – У в. Слабада (Віленскі пав.) нарадзіўся Каспар Валадкевіч (пам. у 1970), беларускі рымска-каталіцкі сьвятар, грамадскі дзеяч. У 1929-33 служыў ксяндзом у Малой Бераставіцы, з 1934 – пробашч у Квасоўцы (Гарадзенскі раён), перад вайной у Анжадаве (Ашмянскі раён).

105 гадоў таму (1906) – У в. Прытычына (Дзісьненскі пав.) нарадзіўся Кастусь Глінскі, юрыст, вязень савецкага канцлягеру, ваяваў у Арміі Андэрса, дзеяч эміграцыі (Вялікабрытанія). У 1930-ых працаваў суддзём у Ашмяне.

**12 лютага**

90 гадоў таму (1921) – Памёр Рудольф Абіхт, нямецкі вучоны-славіст. У 1917-18 выкладаў у Сьвіслацкай настаўніцкай семінарыі беларускую мову.

**13 лютага**

205 гадоў таму (1806) – У Слоніме нарадзіўся Юльян Корсак, паэт, перакладнік.

105 гадоў таму (1906) – У мяст. Гальшаны нарадзіўся Уладзімер Фінькоўскі (час і месца сьмерці невядомыя, пасьля 1960-га), дзеяч праваслаўнай царквы ў Беларусі і на эміграцыі (Нямеччына, Францыя, ЗША).

**15 лютага**

85 гадоў таму (1926) – Нарадзіўся (на Слонімшчыне) Мікола Ягаўдзік, беларускі вайсковец, дзеяч беларускай эміграцыі (Бельгія, ЗША).

**16 лютага**

55 гадоў таму (1956) – Арыштаваны (паводле інш. зьвестак 16 студзеня) і пазьней асуджаны на 7 гадоў зьняволеньня па абвінавачаньні ў “беларускім нацыяналізме” выкладнік Гарадзенскага педагагічнага інстытуту Браніслаў Ржэўскі.

**17 лютага**

95 гадоў таму (1916) – Памерла Цётка (сапр. Алаіза Пашкевіч, у замужжы Кайрыс), беларуская грамадска-палітычная дзяячка, паэтка, асьветніца, выдаўніца. Пахавана ў Старым Двары (Шчучынскі р-н).

**18 лютага**

55 гадоў таму (1956) – У мяст. Мар’янава памёр Янка Быліна (сапр. Ян Семашкевіч), беларускі каталіцкі сьвятар, пісьменьнік, паэт. Нараджэнец в. Лакцяны (Астравецкі р-н). Пахаваны ў в. Бомбля (Беласточчына).

**21 лютага**

Міжнародны дзень роднай мовы.

**26 лютага**

190 гадоў таму (1821) – У мяст. Вайшканы (Ковенская губ.) нарадзіўся Аляксандар Гінтаўт-Дзевалтоўскі, беларускі рэлігійны дзеяч, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху на Гарадзеншчыне.

**27 лютага**

75 гадоў таму (1936) – Адбыўся ўсеагульны штрайк рабочых Ліды (удзельнічала каля 4 тысяч чалавек).

**28 лютага**

395 гадоў таму (1616) – Памёр Мікалай Крыштап Сіротка Радзівіл, дзяржаўны дзеяч ВКЛ, падарожнік-мемуарыст.

РАДЫЯ 98,1 99,2 FM

***Кожны аўторак у эфіры незалежнай радыёстанцыі “Радыё Рацыя” - праграма “Людзьмі звацца!”, якая асвятляе падзеі, датычныя правоў чалавека на Беларусі. Час выхаду ў эфір – 15-05 (паўтор - серада 0:05-1:00 і субота 7:05-8:05). Таксама ў гэты час яе можна слухаць праз інтэрнэт на сайце***

**www.racyja.com**

***Праваабарончую інфармацыю па Беларусі вы можаце атрымаць на сайце***

**www.spring96.org**

Гарадзенскі праваабарончы
інфармацыйна-аналітычны
бюлетэнь «Прэзумпцыя»
выходзіць 1 раз у месяц
наклад 299 асобнікаў
для нутранога карыстаньня

падрыхтаваны да друку:
28. 02. 2011
e-mail:prezumpcyja@gmail.com
распаўсюджваецца задарма
пры передруку спасылка
абавязковая

